Аляксандр МАКАРЭВІЧ

# ПРАБЛЕМНАЕ ВЫКЛАДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў X—XI КЛАСАХ ПА СІСТЭМЕ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ

*Працяг. Пачатак у № 7-8, 9.*

3 — 4-ая гадзіны. Жыццё і творчасць **Я. Купалы.** Трагікамедыя «Тутэйшыя». Літаратуразнаўчы аналіз твора. Форма — камбінаваныя ўрокі семінарскага тыпу. Пытанні да ўрокаў — пункты прапанаванай схемы кароткага літаратуразнаўчага аналізу мастацкага твора; заданні — тыя, што даваліся настаўнікам на папярэдніх двух лекцыйных уроках.

**Асноўныя мэты ўрокаў:**

1. Фармаванне навыкаў:

а) літаратуразнаўчага аналізу мастацкага твора, разгляд якога не праводзіцца ў падручніку;

б) характарыстыкі жыцця і творчасці пісьменніка з улікам новых публікацый, якія былі рэкамендаваны для самастойнага вывучэння.

2. Падрыхтоўка вучняў да калоквіуму і сачынення, выпускнога экзамену.

3. Выхаванне імкнення да самастойнасці ва ўспрыманні і ацэнках літаратурнага твора, грамадска-культурных абставін, у якіх ён ствараўся.

**Структура ўрокаў і пытанні да іх:**

1. Перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.

2. Дамашняе заданне.

3. Праверка ўзроўню выканання пісьмовых заданняў да гэтага ўрока.

4. Характарыстыка жыцця і творчасці Я. Купалы (савецкі перыяд).

5. Пісьмовыя адказы вучняў (3 чал., у час гутаркі настаўніка з класам па іншых пунктах схемы) на пытанні:

а) характарыстыка часу, падзей, якія апісваюцца ў трагікамедыі Я. Купалы «Тутэйшыя»;

б) характарыстыка Мікіты Зносака;

в) характарыстыка Янкі Здольніка і Аленкі Гарошкі.

6. Літаратуразнаўчы аналіз трагікамедыі «Тутэйшыя». Ён можа праводзіцца як адказ на пытанні схемы № 1 з абавязковым зваротам да твора, з паралельным запісам некаторых вывадаў у сшыткі. Формы работы выбірае настаўнік з улікам узроўню падрыхтаванасці вучняў і іх здольнасцяў да самастойнай творчай дзейнасці.

7. Абагульненні і вывады па ўроках 3—5 *.

6—7-ая гадзіны. Паэма **Я. Купалы** «Тарасова доля». Форма ўрокаў — камбінаваныя.

Асноўныя мэты гэтых урокаў тыя ж, што і папярэдніх. Мэта сярэдняй перспектывы — этапная: падрыхтоўка да сачынення ў XI класе «Тэма мастака і мастацтва ў творчасці Я. Купалы і М. Танка».

**Структура ўрокаў і пытанні да іх:**

1. Перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.

2. Дамашняе заданне.

3. Пісьмовыя адказы 3-х вучняў на пытанне «Асаблівасці сюжэта і кампазіцыі паэмы Я. Купалы «Тарасова доля». Прывесці некаторыя прыклады.

4. Франтальная гутарка на прадмет літаратуразнаўчага аналізу паэмы «Тарасова доля» (па схеме № 1).

5. Вырашэнне праблемнага пытання «Ці паўплывалі грамадска-палітычныя падзеі 30-х гг. на спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў паэме?».

6. Метафарызм у мастацкім творы. Роля метафарычных вобразаў у паэме, прыклады з тэксту для пацвярджэння адказу,

7. Роля публіцыстычных частак у паэме «Тарасова доля».

8. Абагульненні і вывады па ўроках 6—7.

8-ая гадзіна. Урок па развіцці

---

* Прапаноўваемая методыка можа прымяняцца не толькі пры вывучэнні «Тутэйшых» Я. Купалы, а і іншых твораў, якія раней не вывучаліся і разбор якіх не даецца ў падручніку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мовы. Падрыхтоўка да дамашняга сачынення па творчасці Я. Купалы.

**Магчымыя тэмы сачыненняў:**

1. Тэма мастака і мастацтва ў творчасці Я. Купалы.
2. Праблемы палітычнага прыстасавальніцтва ў трагікамедыі Я. Купалы «Тутэйшыя».
3. Міфы і рэальнасць пра творчасць Я. Купалы савецкага часу.
4. Мае ўражанні і вывады аб творчасці Я. Купалы савецкага часу.

9—10-ая гадзіны. Лірыка Я. Купалы савецкага часу. Форма ўрокаў — камбінаваныя.

**Структура ўрокаў і пытанні да іх:**

1. Мэтавыя перспектыўныя ўстаноўкі.
2. Дамашняе заданне.
3. Пісьмовыя адказы 3-х вучняў на пытанне «Тэма, ідэйныя кірункі лірыкі Я. Купалы савецкага часу».
4. Аналіз папярэдніх варыянтаў сачыненняў, напісаных дома.
5. Франтальная гутарка па тэме ўрока.
6. Праблемная гутарка па тэме «Міфы аб паэзіі Я. Купалы». Мэтазгодна звяртацца не толькі да твораў савецкага, але і дакастрычніцкага перыядаў. Вялікую дапамогу ў гэтым і настаўніку, і вучням акажуць вывады з даследавання В. Каваленкі «Вяртанне да Купалы» [1].
7. Выразнае чытанне на памяць вершаў Я. Купалы савецкага часу.
8. Абагульненні і вывады па ўроках 9—10.

11-ая гадзіна. Абагульняючы ўрок па творчасці Я. Купалы савецкага часу. Форма — пісьмовы калоквіум.

**Магчымыя пытанні:**

1. Характарыстыка жыцця і творчасці Я. Купалы савецкага перыяду.
2. Літаратуразнаўчы аналіз трагікамедыі Я. Купалы «Тутэйшыя».
3. Даць характарыстыку вобразаў Мікіты Зносака, Насты Пабягунскай, Спічыні, Дамы, Спраўніка, Папа («Тутэйшыя»).
4. Даць характарыстыку вобразаў Ганулі Зносчыхі, Лявона Гарошкі, Янкі Здольніка («Тутэйшыя»).
5. Літаратуразнаўчы аналіз паэмы «Тарасова доля».
6. Тэмы, праблематыка, ідэйны кірунак лірыкі Я. Купалы савецкага часу.
7. Даць азначэнні наступных літаратуразнаўчых тэрмінаў:

а) тэма, ідэя, кампазіцыя, канфлікт, сюжэт мастацкага твора;

б) эпітэт, метафара, параўнанне, гіпербала.

Прывесці прыклады з твораў.

II. **К. Крапіва.** Байкі. Камедыі «Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці».

Магчымы іншыя варыянты вывучэння творчасці К. Крапівы ў кантэксце літаратурнага працэсу гэтага і наступных перыядаў:

напрыклад, замест названых п'ес вывучаць раман «Мядзведзічы» [2]. Звярнуцца да гэтага твора, думаецца, можна ў лекцыі настаўніка, а таксама шляхам праслухоўвання рэфератыўных паведамленняў вучняў, што займаюцца ў літаратурным гуртку ці на курсах на выбар.

Пры вывучэнні творчасці К. Крапівы можна звяртацца да структуры, вызначанай праграмай для сярэдняй школы па беларускай літаратуры [3]. Аднак пры гэтым разгляд ягоных п'ес мэтазгодна спалучаць з урокамі пазакласнага чытання па творах Л. Геніюш, Я. Бяганскай, С. Грахоўскага. У далейшым можна параўноўваць, як такая ж рэчаіснасць адлюстроўвалася іншымі аўтарамі (Я. Купала, К. Чорны, А. Мрый [4], І. Мележ, Я. Брыль і інш.).

**Прыкладнае перспектыўнае планаванне ўрокаў:**

1-ая гадзіна. Характарыстыка жыцця і творчасці К. Крапівы.

2—3-яя гадзіны. Байкі К. Крапівы. Форма ўрокаў — камбінаваныя.

Выхад на сістэму перспектыўных ліній:

а) фармаванне ўменняў і навыкаў літаратуразнаўчага аналізу баек;

б) падрыхтоўка вучняў да пісьмовага калоквіуму па творчасці К. Крапівы, да выпускнога экзамену;

в) фармаванне ўменняў і навыкаў выразнага чытання баек (калі ёсць тэатральны гурток, то паралельна ў часе заняткаў у ім — мастацкага чытання);

г) працяг (ад «Тутэйшых») вывучэння спецыфікі сатырычнага адлюстравання рэчаіснасці, якое затым падмацуецца вывадамі, зробленымі пры разглядзе камедый К. Крапівы, твораў А. Мрыя;

д) фармаванне ўменняў і навыкаў паэтапнага перспектыўнага назапашвання фактаў для міжродавага літаратуразнаўчага аналізу твораў розных пісьменнікаў.

**Структура ўрокаў і пытанні да іх:**

1. Перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.
2. Дамашняе заданне.
3. Байка як твор сатырычнага зместу з алегарычным сюжэтам і вывадам.
4. Вершы і байкі К. Крапівы.
5. Праблематыка, ідэйны змест баек К. Крапівы «Дыпламаваны баран», «Саманадзейны конь», «Махальнік Іваноў», «Жаба ў каляіне» і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

6. Майстэрства К. Крапівы-байкапісца.

7. Выразнае чытанне баек (у тым ліку — на памяць).

8. Абагульненні і вывады па ўроках з выхадам на перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.

4—5-ая гадзіны. К. Крапіва. Камедыі «Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці». Літаратуразнаўчы аналіз твораў. Форма ўрокаў — лекцыя з паралельнымі праблемнымі гутаркамі.

Асноўныя мэты гэтых урокаў тыя ж, што і папярэдніх.

**Структура ўрокаў і пытанні да іх:**

1. Перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.
2. Дамашняе заданне.
3. Камедыя як жанр драматычнай літаратуры.
4. Тэма, праблематыка, канфлікт, ідэйны кірунак камедый «Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці».
5. Майстэрства Крапівы ў развіцці дзеяння, абмалёўцы характараў.
6. Спецыфіка адлюстравання рэчаіснасці ў камедыях К. Крапівы: мастацкая факталагічнасць і ступень адпаведнасці фактаў рэальным падзеям.

Змест вывадаў па камедыі «Хто смяецца апошнім» можа быць прыкладна такім:

Камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» адлюстроўвае даволі пашыраную з'яву ў тагачасным грамадстве — барацьбу з ворагамі, якія сваімі ўчынкамі заміналі народу ісці «ўпэўненым крокам у светлае камуністычнае заўтра». У гэтым сэнсе драматург пэўным чынам аддаваў даніну модзе таго часу, палітычнаму руху тых гадоў: у грамадстве ёсць ворагі — іх трэба выкрываць, абараняць ад іх сумленных людзей. Крапіва сцвярджае, што перамагчы гарлахвацкіх, зёлкіных можна толькі грамадой, аб'яднаўшыся. Адзін жа чалавек наўрад ці зможа супрацьстаяць нахабству гэтых людзей, якія, напачатку прыстасаваўшыся да ўмоў грамадства, пачынаюць затым паступова ў ім ладзіць баль па сваім сцэнарыі, вырашаць лёсы не толькі асобных людзей, але і цэлых калектываў, нарэшце — краіны.

К. Крапіва, традыцыйна адлюстроўваючы рэчаіснасць (роля парткама ў выкрыцці Гарлахвацкага, Зёлкіна), пры гэтым, аднак, звяртае ўвагу на больш значнае, істотнае, чым праблемы адной навуковай установы. Драматург настойліва звяртае ўвагу на тое, што існаванне, заснаванае на страху, гвалце, падаўленні іншадумства, настойліва пранікае ў свядомасць асобы, пэўным чынам дыктуе чалавеку не самыя лепшыя спосабы арганізацыі ягонага жыцця. Прыкладам таму — Туляга. Яго прыродная баязлівасць даводзіцца да абсурдных памераў рэчаіснасцю, у якой ён жыве. І гэтая абсурднасць у паводзінах Тулягі, відаць, не столькі вынік жанравай спецыфікі твора, колькі вынік асэнсавання аўтарам ступені негатыўнага ўплыву на характар чалавека тых абставін, у якіх ён мусіць жыць, якія прымушаюць яго баяцца кожнага новага чалавека, любой больш-менш сацыяльна спрэчнай сітуацыі. Я. Бяганская, напрыклад, так апісвала той час ва ўспамінах «Мая Галгофа»:

«Трыццатыя гады. Яны, на жаль, нібы тая манета, мелі два розныя бакі. Побач з самаадданай працай народа, яго энтузіязмам... у гэты час пачало адбывацца нешта зусім незразумелае і неверагоднае. Набліжалася дваццатая гадавіна Кастрычніка, а ў нас з'явілася безліч «ворагаў»... Як апісаць стан тысяч і тысяч людзей, якія, не ведаючы за сабой ніякай віны, з жахам прыслухоўваліся ўночы да стуку ў дзверы і засыналі толькі пад раніцу, каб увесь наступны дзень з жахам чакаць ночы...

Людзі хадзілі як па гарачым вуголлі. Без ніякай віны яны баяліся раптам апынуцца за кратамі. Кожны пражыты дзень мог быць тваім апошнім днём, кожная пражытая ноч — тваёй апошняй ноччу» [5].

Ідэйныя матывы твора К. Крапіва значна паглыбляе праз вобразы Чарнавуса, Веры.

Чарнавус выхоўваўся як асоба першапачаткова на прынцыпах буржуазнага грамадства (бяром пад увагу яго ўзрост); рысы ягонага ўкладу жыцця — прыстойнасць, добрасумленнасць, адданасць навуцы, далікатнасць. Ён аказваецца разгубленым і бездапаможным у сітуацыі, якую яму арганізавалі Гарлахвацкі з Зёлкіным. І гэта не выпадкова. Бо Чарнавус, зыходзячы са сваіх маральных прынцыпаў, першапачаткова не здольны і думкі дапусціць аб тым, што Гарлахвацкі можа быць такім, якім яго бачыць рэцыпіент * на пачатку камедыі. Таму Гарлахвацкаму і ўдаецца адшукаць у характары Чарнавуса тыя клавішы і націскаць на іх так і з такой сілай, каб атрымаць неабходны гук.

Іншая справа — Вера. Яна — «прадукт» новага часу, новага выхавання. Яна, у адрозненне ад Чарнавуса, пераканана, што ў гэтым свеце патрэбны нахрапістасць, беспрынцыповасць; толькі смела кідаючыся ў бойку, можна перамагчы. Далікатнасць, інтэлігентнасць у адносінах паміж людзьмі

* Рэцыпіент — чалавек, які прымае інфармацыю.— *Заўвага рэд.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

новы час не прымаў. Тут Крапіва ідзе за жыццём, за яго праўдай.

Такім чынам, у сатырычным творы К. Крапіва надзвычай рэалістычна, праўдзіва адлюстроўваў жыццё 30-х гг. У камедыі аўтару ўдалося ўзняцца да значных сацыяльных абагульненняў. Асабліва гэта добра відаць, калі п'есу ўспрымаць у кантэксце такіх твораў, як «Мілы чалавек» і «Брама неўміручасці».

Рэчаіснасць 30-х гг. адлюстравана таксама ў творах «Споведзь» Л. Геніюш, «Мая Галгофа» Я. Бяганскай, «Зона маўчання» С. Грахоўскага. Гэтыя творы надзвычай выразна дапаўняюць і ўдакладняюць ідэйны сэнс камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім». Грамадства, якое не здольнае супрацьстаяць дыктатарству, хамству, невуцтву яго кіраўнікоў, становіцца ў іх заложнікам. Чарнавус, Вера, Туляга — патэнцыяльныя палітвязні, далейшы лёс якіх мог быць падобным да лёсу многіх людзей, пра якіх вядуць гутарку ў сваіх творах Л. Геніюш, Я. Бяганская, С. Грахоўскі.

7. Абагульненні і вывады па ўроку з выхадам на перспектыўныя мэтавыя ўстаноўкі.

6—7-ая гадзіны. К. Крапіва. «Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці». Форма ўрокаў — урокі семінарскага тыпу.

Асноўныя пытанні да іх — пункты схемы № 1, дадатковыя — тыя праблемныя, што былі вылучаны на папярэдніх уроках.

На гэтым можна спыніць непасрэднае вывучэнне творчасці К. Крапівы, звярнуўшыся далей да параўнальнага аналізу мастацкай факталагічнасці, ідэйнага зместу камедыі «Хто смяецца апошнім» з гэтым жа ў творах Л. Геніюш, Я. Бяганскай, С. Грахоўскага.

Урокі пазакласнага чытання (2 гадзіны). «Споведзь» Л. Геніюш, «Мая Галгофа» Я. Бяганскай, «Зона маўчання» С. Грахоўскага. Форма ўрокаў — вусныя паведамленні вучняў з далейшым абмеркаваннем іх групай, якая чытала адпаведны твор.

8-ая гадзіна. Творчасць К. Крапівы. Урок па развіцці мовы.

**Мэта ўрока:**

1. Фармаванне ўменняў і навыкаў:

а) вуснага творчага выступлення па раней абвешчанай тэме;

б) дыскусіі па гэтай жа тэме.

2. Этапная падрыхтоўка будучага дамашняга задання.

**Магчымыя тэмы сачыненняў:**

1. Выкрыццё прыстасавальніцтва і невуцтва ў камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім».

2. Сатырычныя вобразы камедыі.

3. Рэчаіснасць 30-х гг. у камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» і аповесці С. Грахоўскага «Зона маўчання». (Альбо: «Хто смяецца апошнім» — «Мая Галгофа» ці «Хто смяецца апошнім» — «Споведзь» — у залежнасці ад таго, з якім творам азнаёміўся вучань да ўрока пазакласнага чытання.)

9-ая гадзіна. Абагульняючыя заняткі па творчасці К. Крапівы. Форма ўрока — у залежнасці ад ступені засваення матэрыялу вучнямі і дасягнення акрэсленых перспектыўных мэт.

*Заканчэнне будзе.*

---

[1] **Каваленка В.** Вяртанне да Купалы // Літаратура і мастацтва. 1993. 22 студзеня.— С. 6—7, 12.

[2] Праграма-праспект па беларускай літаратуры... // Роднае слова. 1993. № 1.— С. 56—57.

[3] Праграма сярэдняй школы. Беларуская мова і літаратура. V—XI класы школ з рускай мовай навучання.— Мн., 1992.— С. 77—78.

[4] Праграма-праспект па беларускай літаратуры... // Роднае слова. 1993. № 4.— С. 54—55.

[5] **Бяганская Я.** Мая Галгофа. Старонкі перажытага // Полымя. 1990. № 3.— С. 132—133.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова